Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. На гэтым тыдні вас могуць парадаваць прывабныя дзелавыя прапановы. Аднак у гэтага ёсць і адмоўны бок: з радасці вы можаце ўзваліць на сябе непасільную ношу. У выніку атрымаеце пшык, а выматаецеся моцна. Так што лепш не гарэць на працы і не забываць пра асабістае жыццё. Разлічваць давядзецца, як заўсёды, толькі на сябе. На шчасце, на адсутнасць сіл скардзіцца не выпадае.

ЦЯЛЕЦ. Вашы сілы, уменні і здольнасці будуць у поўнай меры запатрабаваны. Разбірайцеся ў справах паступова, не варта ладзіць нязменныя працоўныя вахты. Можа пацягнуць на любоўныя подзвігі — гэтыя парывы лепш стрымаць. Пачатае ў пятніцу павінна быць у пятніцу ж і закончана. Тое, што немагчыма змясціць у адзін дзень, лепш адкласці на будучыню. Хатнія клопаты толькі палепшаць настрой.

БЛІЗНЯТЫ. Тыдзень можа прынесці новы ўсплёск пачуццёвасці, энергію, здароўе і поспех. Чакайце прыемных сюрпрызаў. Вас акружаць любоўю і клопатам. Толькі пастарайцеся справіцца са сваёй эмацыянальнасцю і настроіцца на лепшае — і яно абавязкова здарыцца. Могуць аднавіцца важныя страчаныя кантакты і сувязі. Выпадковыя сустрэчы адкрыюць новыя перспектывы. Дзеці парадуюць. А калі ў вас іх пакуль няма, то хутка будуць.

РАК. Можа атрымацца проста казачны тыдзень. Здароўе, кар'ера і свецкае жыццё будуць радаваць. Цяжар непатрэбных абавязацельстваў спадзе з вашых плячэй. Праўда, у сераду падзеі могуць прыняць не той абарот, якога вы чакалі. Найбольш значным днём тыдня можа аказацца аўторак, толькі дакладна вызначце, чаго вы хочаце дасягнуць у найбліжэйшы час, і настойліва прасоўвайцеся да мэты, нягледзячы на цяжкасці. У канцы тыдня можна разлічваць на актыўны адпачынак і прыгоды.

ЛЕЎ. На рабоце могуць узнікнуць праблемы, якія некаму будзе вырашыць, акрамя вас. Пры гэтым становішча ў калектыве можа лёгка распаліцца, і больш за ўсё шанцаў яго разрадзіць — зноў жа ў вас. Зоркі абяцаюць, што вашы стараннi будуць ацэнены належным чынам. У аўторак можна спадзявацца на сваю інтуіцыю, але памятайце, што саступаючы і згаджаючыся вы больш набудзеце, чым страціце. У нядзелю паспрабуйце добра адпачыць, каб скінуць напружанне.

ДЗЕВА. У сераду любая справа будзе атрымоўвацца і практычна любая мара мае шанц спраўдзіцца, калі, вядома, для гэтага не давядзецца ўшчаміць інтарэсы іншых. У чацвер можа з'явіцца непераадольнае жаданне змяніць кола зносін. Ёсць вялікая верагоднасць з'яўлення блізкіх па духу сяброў, аднак сцеражыцеся нядобранадзейных людзей, яны могуць падвесці. У суботу накіруйце сваю энергію на рашэнне хатніх спраў.

ШАЛІ. Праца — прыярытэт гэтага тыдня. Ад яе выніку могуць залежаць настрой, кар'ера і прыбытак. Некаторыя планы давядзецца змяніць, жыццё будзе карэктаваць іх па-свойму. Можаце адправіцца ў далёкую паездку. Паспрабуйце даваць парады калегам і сябрам ненавязліва — тады вас ацэняць і будуць прыслухоўвацца.

СКАРПІЁН. Будуць шанцы дамагчыся поспеху. Вы ў ліку першых даведаецеся пра важныя навіны. Многія справы і праекты завершацца ўдала і прыбыткова. Не бойцеся расставацца з непатрэбнымі рэчамі і старымі прынцыпамі — будзе магчымасць абзавесціся новымі. Уядаць кагосьці на гэтым тыдні не рэкамендуецца, лепш казаць сур'ёзна і шчыра. Любоўнае спатканне запомніцца надоўга.

СТРАЛЕЦ. Самае важнае — засяродзіцца і нічога не забыцца. Можа спатрэбіцца здольнасць хутка перамяшчацца і змяняць планы. Магчымыя камандзіроўкі, якія будуць спрыяць паляпшэнню матэрыяльнага становішча. Паспрабуйце не ленавацца і не адкладваць назапашаныя справы, а па магчымасці вырашаць іх адразу. Пятніца — добры дзень для абмеркавання новых ідэй з начальствам.

КАЗЯРОГ. Высокая імавернасць канфліктаў і спрэчак на пустым месцы, прычым як на рабоце, так і дома. Лепш стрымаць свой гнеў і раздражняльнасць. У чацвер пачнуць рэалізоўвацца запаветныя жаданні. Не забудзьцеся наведаць сваякоў, ім неабходна ваша ўвага. Паспрабуйце суразмерна выкарыстоўваць свае сілы, каб не вельмі стаміцца да канца тыдня.

ВАДАЛІЎ. Шматлікія перашкоды і абмежаванні на вашым шляху проста знікнуць. Дзейнічайце, рухайцеся наперад. У панядзелак удача будзе спадарожнічаць вам, многія справы паспяхова вырашацца, але не варта спяшацца з пачаткам новых праектаў. У сераду неабходна старанна ўсё перагледзець, прызнацца ў дапушчаных памылках і пастарацца заняцца іх выпраўленнем. У выхадныя ад вас будзе залежаць сямейны дабрабыт, не сыходзьце ад адказнасці.

РЫБЫ. Неабходна навучыцца жыць у згодзе з самім сабой і навакольнымі. Непажадана ў парыве праведнага гневу сварыцца з блізкімі людзьмі. Вашы энергія і напор зробяць вялікі ўплыў на ўсіх, з кім трэба будзе мець зносіны. Сярэдзіна тыдня добрая для рашучых дзеянняў у асабістым жыцці. Бліжэй да канца тыдня займіцеся добраўпарадкаваннем дома або дачы. Дзякуючы невялікім зменам, створаным вашымі рукамі, усё стане яшчэ больш утульным.

Даты | Падзеі | Людзі

5 ЛІПЕНЯ

1789 год — нарадзіўся (маёнтак Пыратава, цяпер у Уздзенскім раёне) Фадзей Венядзіктавіч Булгарын, рускі журналіст, пісьменнік. Выдаваў газету «Северная пчела», часопіс «Сын отечества». Як літаратурны крытык выступаў супраць рэалістычнага кірунку ў літаратуры. У рамане «Іван Выжыгін», ва ўспамінах і некаторых нарысах адлюстраваў побыт беларусаў. Памёр у 1859 годзе.

1899 год — нарадзіўся Андрэй Фёдаравіч Печкуроў, беларускі вучоны ў галіне меліярацыі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Распрацаваў метады рэгулявання рэк — водапрыёмнікаў, асушальных сістэм, удасканаліў разлікі рэчышчаў рэк і каналаў. Памёр у 1996 годзе.

1949 год — нарадзіўся Аляксандр Афанасьевіч Стаўроў, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. Распрацаваў метады ўліку характарыстык атмасферы пры лазернай лакацыі паветрана-касмічных аб'ектаў, методыкі аптымізацыі параметраў оптыка-лакацыйных комплексаў і іх інфармацыйных каналаў.

1954 год — нарадзіўся Віктар Сяргеевіч Аверын, беларускі вучоны ў галіне радыебіялогіі і радыеэкалогіі, доктар біялагічных навук. З 1990 года — намеснік дырэктара Інстытута радыялогіі НАН Беларусі, з 2005-га — загадчык аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека (Гомель). Аўтар навуковых прац па аптымізацыі аграпрамысловай вытворчасці, вядзенні асабістай дапаможнай гаспадаркі ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання.

1969 год — на Лагойшчыне адбылося адкрыццё мемарыяльнага архітэктурна-скульптурнага комплексу «Хатынь». Аўтары — архітэктары Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін, скульптар Сяргей Селіханаў — за стварэнне гэтага помніка найвялікшага эмацыянальнага і патрыятычнага гучання былі ўдастоены ў 1970 годзе Ленінскай прэміі. У гэты ж дзень адкрыты Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

1889 год — нарадзіўся Жан Както, французскі пісьменнік-авангардыст, кінарэжысёр, акцёр і мастак. Памёр у 1963 годзе.

1954 год — у Мемфісе 19-гадовы Элвіс Прэслі запісаў сваю першую песню, якая называлася «That's All Right, Mama» («Усё ў парадку, мама»). Многія лічаць гэтую дату не проста пачаткам творчага шляху спевака, але і днём нараджэння рок-н-рола. Прэслі з'явіўся на запіс у ружовым гарнітуры, белых туфлях і з вялізным чубам. Калі запіс быў выкананы, адзін з музыкаў вымавіў: «Людзі нас лінчуюць, калі гэта пачуюць».

1959 год — нарадзіўся Ігар Юр'евіч Волкаў, расійскі акцёр. Здымаўся ў многіх фільмах, сярод якіх — «Міхайла Ламаносаў», «Глушэц», «Трэцяя сусветная».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.45	21.43	16.58
Віцебск —	4.26	21.40	17.14
Магілёў —	4.35	21.33	16.58
Гомель —	4.41	21.20	16.39
Гродна —	5.02	21.56	16.54
Брэст —	5.12	21.48	16.36

Месяц

Маладзік 2 ліпеня.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Ульяны, Генадзя, Яўсея.*
К. *Зоі, Караліны, Марыі, Антона, Апанаса, Міхала, Якуба.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Сёння ўбачыла, як дзяўчынка гадоў 15-ці купляе амаладжальны крэм. Ну зусім ужо, мне тады ў свае 30 самы час на пенсію!

— Можа, ёй 40, проста крэм добры.

Самая страшная фраза ў сацсетках пасля гулянкі: «Ваш сябар адзначыў вас на фатаграфіі».

— Сыходзіць крыху раней з работы — дрэнная прыкмета.

— Чаму?

— Вось Вася пайшоў і развёўся.

Адкрыццё маладога бацькі. Аказваецца, апранаць маленькіх дзяўчынак значна складаней, чым распранаць вялікіх.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2334. Нумар падпісаны ў 19.30 4 ліпеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12